Л. М. ДАРАФЕЙЧЫК
Пінскій р-н, ДУА “Табульская сярэдняя школа ”

АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНА – ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Кожнаму грамадству патрэбны адукаваныя і адораныя людзі, таму ў кожным грамадстве павінны быць створаны належныя ўмовы для таго, каб разгледзіць і развіць задаткі і здольнасці ўсіх грамадзян. І найгалоўнейшая роля тут належыць сям’і і школе.

Задача сям’і – разгледзець задаткі і здольнаці дзіцяці , а задачы школы –падтрымаць дзіця і развіць іх, падрыхтаваць глебу для таго, каб гэтыя здольнасцібылі рэалізаваны ў жыцці. Слушным на сённяшні дзень будзе такі тэзіс: “*Школа павінна займацца пошукам індывідуальнасці”*. Ужо ў пачатковай школе можна сустрэць вучняў, якіх не задавальняе работа толькі са школьным падручнікам, не цікавіць работа на ўроку, яны чытаюць слоўнікі і спецыяльную літаратуру, шукаюць адказы на свае пытанні. Таму вельмі важна менавіта ў школе выявіць тых , хто цікавіцца рознымі галінамі навукі і тэхнікі, вывесці школьнікаў на дарогу пошуку, дапамагчы ім найбольш поўна раскрыць сябе.

Неабходна памятаць: у кожнага дзіцяці есць пэўныя здольнасці і талент. Дзеці па сваей прыродзе дапытлівыя, і неабходна зрабіць для таго, каб яны маглі праявіць свой талент, - дык гэта разумнае кіраўніцтва з боку неабыякавых дарослых.

Развіцце творчага патэнцыялу вучняў па беларускай мове і літаратуры можна прадставіць у наступнай схеме:

- тыдні беларускай мовы і літаратуры;
- прадметныя алімпіяды;
- факультатывы;
- інтэлектуальныя гульні;
- конкурсы;
- рэспубліканскі конкурс “Буслік”;
- навукова-даследчая праца.

Для развіцця пазнавальнай і творчай актыўнасці вучняў, на маю думку, праводзяцца тыдні па беларускай мове і літаратуры.

Мэты тыдня:

- прывіваць цікавасць да беларускай мовы як адметнай лінгвістычнай з’явы і як навучальнага прадмета;
- прывіваць пачуцце гонару за духоўную культуру беларусаў - частку багатай культуры славянскага свету;

- стварыць у школе ўмовы для развіцця творчых здольнасцей вучняў.

Падчас тыдня праводзяцца розныя мерапрыемствы: святыМасленіца", "Гуканне вясны" лінгвістычныя віктарыны, літаратурныя гасцёўні, конкурсы-спаборніцтвы і іншае

Правядзенне прадметнай алімпіяды спрыяе павышэнню вучняў цікавасці да вучобы, развіццю іх пазнавальных здольнасцей, пашырэнню кругагляду.

Я прыйшла да вызаду, што сістэматычнае правядзенне інтэлектуальных гульняў дапамагае павысіць актыўнасць вучняў, унесці элементы спаборніцтва ў адукацыйны працэс, замацаваць паняцце пра веды як важны фактар развіцця асобы.

Удзел у конкурсах дае магчымасць вучням заявіць пра сябе, праявіць

здольнасці, веды, не губляць самаавалодання незвычайных умоў урока, а ў атмасферы агульнай увагі зацікаўленасці.

З улікам індывідуальных асаблівасцей і схільнасцей вучняў і з мэтай выяўлення і падтрымкі адораных дзяцей у школе павінна быць створана навуковае таварыства вучняў. Гэта добраахвотнае творчае фарміраванне вучняў, якія імкнуцца ўдасканальваць свой інтэлект, набываць уменні і навыкі навукова-даследчай дзейнасці пад кіраўніцтвам выкладчыкаў.

Адной з секцый навуковага таварыства вучняў павінна быць дзейнасць лінгвістычнай секцыі, якая будзе скіравана на тое, каб развіць асобу кожнага вучня, дапамагчы яму стаць шукальнікам ведаў, а не гатовым іх спажыўцом. Шмат ўвагі ўдзяляць выкананню творчых заданняў з улікам спецыфічных запытаў вучняў, а таксама авалоданню навучэнцамі навукова-даследчымі агульнаарганізацыйнымі ўменнямі і навыкамі (працаваць з даведчай літаратурай, карыстацца бібліятэчным фондам, канспектаваць і крытычна аналізаваць прачытанае, складаць розныя віды планаў, табліц і схем, карыстацца алгарытмамі, працаваць над дакладамі, рэфератамі, праводзіць эксперыментальную і навукова-даследчую работу, карыстацца інфармацыйнымі тэхналогіямі, выпрацоўваць звычку самааналізу, самакантролю).

Менавіта навуковыя таварыствы школьнікаў і спрыяюць павышэнню цікавасці да навукова - даследчай дзейнасці. Найважнейшай умовай арганізаці навуковай работы вучняў з'яўляецца своечасовае кіраўніцтва гэтым працэсам. Даследчую работу вучняў неабходна арганізоўвацьпаэтапна. Мэтазгодна выдзеліць наступныя этапы такой дзейнасці:

- 1 падрыхтоўчы - 3-7-ы класы;
- 2 развіццёвы - 8-9 ы класы;

- 3 даследчы - 10-11-ы класы.

Падрыхтоўчы этап прадугледжвае фарміраванне ў вучняў навыкаў навуковай арганізацыі працы, хуткага чытання, работы з падручнікам і слоўнікам. На гэтым этапе адбываецца далучэнне навучэнцаў да актыўных форм вучэбнай дзейнасці, а таксама выяўленне найбольш здольных да творчасці вучняў.

Важнае значэнне ў развіцці здольных і адораных дзяцей мае работа з даведачнай, навукова-пазнавальнай літаратурай.

Развіццёвы этап прадугледжвае ўдасканаленне ў вучняў навыкаў навуковай арганізацыі працы, актыўнае пашырэнне іх кругагляду. На гэтым этапе вучні асвойваюць спецыфіку работы з першакрыніцамі, знаёмяцца з дзейнасцю архіваў, асэнсоўваюць навукова-даследчую дзейнасць.

Даследчы этап- гэта непасрэдная навукова-даследчая дзейнасць вучняў.

Для таго каб даследчая дзейнасць была перспектыўнай, неабходна забяспечыць пераемнасць у гэтай рабоце. Так, вучні старэйшых класаў могуць праводзіць гутаркі, класныя гадзіны, сацыялагічныя даследаванні сярод малодшых школьнікаў.

Прымаючы ўдзел у навукова-даследчай рабоце, вучань займае актыўную пошукавую пазіцыю, спрабуе знайсці адказ на пытанні, якія яго цікавяць. Распрацоўваючы абраную тэму даследавання, ён не абмяжоўваецца падручнікам і вучэбным матэрыялам, а звяртаецца да розных інфармацыйных крыніц. Такім чынам удасканальваюцца і структурыруюцца навыкі работы з вялікім аб'ёмам інфармацыі.

Да навуковай работы пажадана далучаць вучняў, зацікаўленых у даследчай дзейнасці, якія валодаюць аналітычнымі здольнасцямі ікрытычным мысленнем. Зразумела, вынік работы паляпшаецца, калі вучань самастойна прымае рашэнне заняцца такім відам дзейнасці, Ствараецца мадэль навуковага пошуку ў школьных умовах.

Кожны вучань, які займаеццанавукова - даследчай дзейнасцю, прымае ўдзел у школьнай навукова-практычнай канферэнцыі "Першыя крокі ў навуку" На гэтай канферэнцыі ён выступае з дакладам, напісаным па тэме сваёй навукова-даследчай працы Якім жа павінен быць даклад на навукова-практычнай канферэнцыі? Гэта павінна быць самастойнае даследаванне, выкананае пад навуковым кіраўніцтвам. Зразумела, гэта неабавязкова павінна быць "новым словам у навуцы". Дастаткова, калі такая праца стане адкрыццём для самога даследчыка, таму што мэта навуковых канферэнцый - не дасягненне невядомага навуковага выніку, а атрыманне радасці ад самаго працэсу даследавання.

Напісаная вучням праца і даклад па ёй - зусім розныя жанрынавуковай творчасці, да якіх трэба рыхтавацца па-рознаму, Даклад, не павінен дубліраваць працу, быць перагружаным звесткамі. Гэтым абумоўліваецца і строгі рэгламент выступленняў на навуковых канферэнцыях. Сапраўды, для асвятлення сутнасці працы 10 хвілін (і гэта не вельмі залежыць ад аб'ёму самой працы). Калі ў прысутных узнікла цікавасць да тэмы выступлення, дакладчык адказвае на іх пытанні.

Асноўнымі фактарамі паспяхова даследчай дзейнасці вучняўз'яўляюцца:

- *захаванне прынцыпу добраахвотнасці;*
- *добраахвотнаць выбару тэмы вучнем;*
- *максімальная самастойнасць вучняў у працэсе правядзення даследавання;*
- *кампетэнтнае і зацікаўленае кіраўніцтва настаўніка вучнёўскай даследчай работай;*
- *усведамленне школьнікамі значнасці карыснасцівыкананай імі работы*.

Неабходна таксаманапомніць, што такая форма пазаўрочнай дзейнасці не павінна насіць масавы характар - не кожны вучань здольны самастойна вызначыцца ў выбары тэмы і пастаноўцы праблемы, граматна напісаць навукова-даследчую працу.

Зразумела, што настаўнік кіруе навуковай дзейнасцю вучня, аднак найперш у якасці кансультанта. Ён можа даць рэкаменднацыі па фармулёўцы тэмы, змесце ўводзін і заключэння, падбору ілюстрацыйнага матэрыялу, крыніцах інфармацыі па праблеме, афармленні тэксту і працэдуры абароны. Абазначыць актуальнасць праблемы, пабудаваць тэкст, сфармуляваць вывады павінен сам вучань.

Даследчая работа патрабуе ад вучня ўмення праблемна думаць, выхоўвае мэтанакіраванасць і ўменне весці навуковую дзейнасць.

Цікавасць дзяцей да даследчай дзейнасці расце з кожным годам, павялічваецца колькасць удзельнікаў навуковых канферэнцый рознага ўзроўню. Удзел у рабоце навуковага таварыства спрыяе ўдасканаленню развіццю даследчых, пазнавальных і творчых здольнасцей вучняў.

ПРЫКЛАДНЫЯ ВІДЫ І СТРУКТУРА ДАСЛЕДЧЫХ ПРАЦ

Даклад

- навукова-практычная значнасць тэмы (кароткія ўводныя заўвагі);

- сутнасць тэмы, абгрунтаваныя навуковыя прапановы;
- вывады.

Тэзісы даклада

- асноўныя палажэнні даклада;
- асноўныя вывады і прапановы.

Навуковы артыкул

- загаловак;
- уводныя заўвагі;
- кароткія звесткі пра методыку даследавання;
- аналіз ўласных навуковых вынікаў і іх абагульненне;
- вывады і прапановы; спасылкі на літаратуру, якую цытавалі ў навуковым артыкуле.

Навуковая справаздача

- кароткі выклад плана і праграмы, этапаў навуковай работы
- значнасць праведзенай работы, яе каштоўнасць для навукі і практыкі;
- дэталёвая характарыстыка метадаў, якія прымяняюцца;
- існаванне новых вынікаў;
- заключэнне пра вынікі даследавання і нявырашаныя пытанні;
- вывады і прапановы.

Рэферат

- уводная частка;
- асноўны тэкст; заключная частка;
- спіс літаратуры;
- паказальнікі.

Манаграфія

- уводзіны;
- падрабязна і ўсебакова даследуецца і асвятляецца якая- небудзь адна з праблем ці тэма;
- вывады па кожным раздзеле;
- заключэнне.

Этапы работы над навуковым даследаваннем

- Азнаямленне з пералікам прапанаванай тэматыкі выбартэмы.
- Вывучэнне прапанаванай навуковым кіраўніком літаратуры.
- Напісанне на аснове вывучаных матэрыялаў і тэматычнага слоўніка аналізу ўласна вывучанай тэмы.
- Выкананне эксперыментальнай ці даследчай часткіпрацы.

ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН НАПІСАННЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ПРАЦЫ

• Уводзіны.

- Ва ўводзінах аўтар абгрунтоўвае выбраную тэму, коратка тлумачыць учым заключаецца яго навуковы інтарэс.
- Іраздзел. Мэта работы.

У гэтым раздзеле аўтар раскрывае задачы, якія павінны быць вырашаны ў працы, вызначае шляхі іх вырашэння, дае характарыстыку прадмета даследавання.

IIраздзел. Методыка правядзення эксперыментальнай цідаследчай часткі працы.

Падрабязнае апісанне самой методыкі. Прыводзіцца спіс пытанняў, якія былі выкарастаны для выканання методык, апісанне груп, якія прымалі ўдзел у даследаванні.

- III раздзел. Навуковая (тэарэтычная) частка працы.

Аўтар дае кароткі аналіз літаратуры, прачытанай па дадзенай тэме, апісвае працэсы ці з'явы, якія ілюструюцца і непасрэдна адносяцца да эксперыментальнай часткі працы.

• IV раздзел. Аналіз даследчых вынікаў.

У гэтым раздзеле аўтар аналізуе вынікі, атрыманыя ў ходзе эксперыменту.

• V раздзел. Вывады.

Аўтар робіць уласныя вывады пра вынікі, атрыманыя ў ходзе эксперыменту, супастаўляе іх з тэарэтычным матэрыялам трэцяга раздзела. Спіс выкарыстанай літаратуры.

- VI раздзел. Спіс выкарыстанай літаратеры.

Аўтар прыводзіць спіс выкарыстанай літаратуры.

АГУЛЬНЫ ПЛАН ВЫКЛАДУ НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ

1. На першай старонцы называецца тэма, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, горад, нумар школы, клас. Назва працы павінна лаканічна адлюстроўваць змест даследавання.

2. Змест размяшчаецца ў пачатку або ў канцы вялікай па аб'ёму працы, Для невялікіх паведамленняў (артыкул, тэзісы) неабходнасці ўзмесце няма.

3. Прадмова. Неабавязковая частка публікацыі, у якойагаворваюцца знешнія ўмовы стварэння навуковай працы.

4.Уступ (уводзіны). У гэтай частцы аўтар уводзіць чытачаў кола праблем, ставіць мэту і асноўныя задачы, аргументуе актуальнасць і характарызуе агульны стан праблемы да пачатку даследаванняў.

5. Агляд літаратуры. У раздзеле даецца рэтраспектыўны аналіз літаратурных крыніц, вывучаных даследчыкам. Неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на правільнасць спасылак.

6. Асноўная частка. Ключавы раздзел навуковай працы. У даследаваннях тут павінны быць адлюстраваны наступныя раздзелы:

- матэрыял і методыка;
- апісанне месца і ўмоў даследаванняў;
- асноўныя вынікі даследаванняў;
- абагульненні і вывады.

7. Заключэнне. Абагульненне найбольш істотных палажэнняўпрацы. Падвядзенне вынікаў.

8.Перспектывы даследавання. Гэтую частку можна размясціць узаключэнні.

9. Спіс літаратуры. У спісе павінны быць указаны ўсе літаратурныя крыніцы, на якіх спасылаецца аўтар у сваёй публікацыі.

10. Дадаткі.

Агульныя патрабаванні да прац, прад'яўленых наканферэнцыю:

- дакладнасць і даступнасць матэрыялу;
- адпаведнасць тэмы працы яе зместу;
- актуальнасць і практычная значнасць яе зместу;
- эрудыцыю аўтара, умелае выкарыстанне розных пунктаў
- погляду па тэме працы; асабістыя погляды і вывады па праблеме;
- ўменне выкарыстоўваць спецыяльную тэрміналагічную літаратуру па тэме;
- афармленне навуковай працы;

- культура выступлення на канферэнцыі,

Крытэрыі ацэнкі выступлення.

1. Тэма выступлення (шырокая, вузкая, канкрэтная).

2. Актуальнасць, навізна, праблематычнасць тэмы,

3. Ступеньразумення матэрыялу (глыбіня аналізу, інфарматыўнасць па дадзеным пытанні, змест даклада, узровень дасягнення мэты).

- 4. Ступень самастойнасці.
- ці ўдалося пазбегнуць паўтарэння праграмнага матэрыялу;
- да якога тыпу належыць навуковая праца: творчага, які мае элементы самастойных доследаў канкрэтнага матэрыялу) або рэфератыўнага (звязанага здыскусіўнымі пытаннямі, якія не маюць адназначнага тлумачэння ў сучаснай навуцы);
- наколькі творча падышоў вучань да выбранай тэмы, ці ёсць элементы навуковага даследавання.

5. Выкарыстанне навуковай літаратуры,

6. Майстэрства выкладання;

- Кампазіцыйная цэласнасць: уступ (тэма, мэта, гісторыя пытання, матывацыя выбранай тэмы), логіка і звязнасць галоўнай часткі, уменне тэарэтычна абагульняць і аналізаваць;
- заключэнне, вынік у выглядзе выводу па ўсёй тэме, перспектывы далейшай распрацоўкі тэмы.
- Валодае спецыяльнымі тэрмінамі, спецыяльнайлексікай.
- Наяўнасць дадатковых табліц, схем.

7. Эстэтычнасць афармлення.

Даследчыя ўменні, неабходныя вучню для напісаннянавукова-даследчай працы.

1. Уменне працаваць з рэкамендаванай літаратурай.

Уменне працаваць з літаратурнымі крыніцамі - аснова навуковага даследавання. Неабходна чытаць матэрыял паслядоўна, дасканала вывучыць усе тэрміны ці паняцці, знайсці яму пацвярджэнне: практычны прыклад ці практычнае тлумачэнне.

2. Уменне крытычна асэнсоўваць матэрыял.

Для таго каб упэўніцца, што тое ці іншае палажэнне правільнае, неабходна навучыцца самастойна супастаўляць паняцці і з'явы, рабіць уласныя вывады. Абгрунтоўваючы правільнасць ці няправільнасць таго ці іншага паняцця, неабходна ставіць сабе наступныя пытанні:

- Якое меркаванне з прапанаваных у літаратуры найбольш эфектыўнае?
- Ці пацвярджаецца тэарэтычнае палажэнне фактычнымматэрыялам?

3. Уменне дакладна і зразумела выкладаць свае думкі.

Кожнае палажэнне даследавання неабходна выкладаць паслядоўна, не пераскокваць з адной праблемы на другую. Упрацы павінны быць выкарыстаны такія словы івыразы, як "*Я лічу*", "*Я думаю*", "*Мне вядома*", *"Я не згодзен з тым, што…*" іншыя.

Рэкамендацыі настаўнікам і бацькам па выхаванні ў дзяцейдаследчых здольнасцей і ўмення самастойна здабываць веды.

- Не займайцеся павучэннямі, дапамагайце дзецям дзейнічаць незалежна, не давайце адназначных інструкцый адносна таго, чым яны павінны займацца.
- Не стрымлівайце ініцыятыву вучняў і не рабіце за іх тое, што яны могуць рабіць самастойна. Навучыце дзяцей прасочваць міжпрадметныя сувязі, выкарыстоўваць веды, атрыманыя пры вывучэнні іншых прадметаў.
- Прывучайце вучняў да самастойнага вырашэнняпраблем, даследавання і аналізу сітуацыі.
- Даследуйце складаныя сітуацыі, якія ўзніклі ў дзяцей у школе ці дома.
- Дапамагайце дзецям вучыцца кіраваць працэсам засваення ведаў. Падыходзьце да ўсяго творча.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Сергеева, М. Г. Наука и образование в современном мире / М.Г Сергеева.// Развитие исследовательской деятельности учащихся: метод сб./ сост и ред. А Обухов М Нар. Образование, 2001. - С. 33.
2. Толстой Л Н. Педагогические сочинения / Л. Н. Толстой: сост. Н. В (Кудрявая). - М.: Педагогика, 1989. - 544 с. 14
3. Кудрова И.А. О развитии мышления на основе исследовательского подхода!
Н.А. Кудрова // Стандарты и мониторинг в образовании - 2006 - № 5 - С. 14-
4. Мухина В. Психологический смысл исследовательской деятельности для развития личности / В. Мухина // Народнобразование. - 2006, - № 7. - С. 123-127
5. Брыкова О Сотворчество учителя и ученика / О. Брыкова Управлениешколой: изд дом Первое сентября, - 2006. - № 20. С. 33-36
6. Глазкова К.Р. Уроки-исследования формирование творческой, критическимыслящей личности К.Р. лазкова, С.А. Живодробова Физика изд. домПервое сентября. - 2006. - № 24. - С. 29-31
7. Коротаева Е.В. Активизация познавательной леятельности учащихся. Вопросытеории и практики / Е.В, Коротаева. - М.: Екатеринбург, 1995. - 84с.
8. Пидкасистый П.Н. Самостоятельная познавательная деятельность школьниковв обучении: теоретико-экспериментальное исследование / III. Пидкасистый.М.: Пелагогика, 1980 - 280с.